***В.В. Плісюк***

БГЭУ(Минск)

# ІДЭЁЛАГ «КРАЁЎЦАЎ» – РАМАН СКІРМУНТ

Раман Аляксандравіч Скірмунт (1868-1939) – сенатар Дзяржаўнай Думы Расейскай імперыі, прэм'ер-міністр БНР, лідар краёўцаў.

Раман Скірмунт нарадзіўся ў маёнтку Парэчча на Піншчыне. Атрымаў адукацыю ў Рыжскай класічнай гімназіі, потым вывучаў юрыспрудэнцыю ў Варшаве. Па вяртанні на радзіму займаўся грамадскімі і палітычнымі справамі.

Свае погляды Скірмунт паклаў у аснову накірунку грамадска-палітычнага руху «краёўцаў» – аргranізацыі, мэтай якой было аб'яднанне трох галоўных народаў краю – беларусаў, палякаў, літоўцаў. Трапіўшы ў 1906 годзе ў Дзяржаўную Думу Расейскай імперыі, намагаўся рэалізаваць свае ідэі на дзяржаўным узроўні. Але ў гэты час пачынаюць узнікаць самастойныя польскія і літоўскія рухі, таму ідэі «краёўцаў» не маглі быць рэалізаваны.

Свае сілы Раман Скірмунт накіроўваў на падтрымку беларускага нацыянальнага адраджэння. Спачатку фінансава падтрымліваў газету «Наша Ніва», а потым адгукнуўся на запрашэнне М. Багдановіча і ўступіў у Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. Менавіта гэтым Таварыствам было арганізавана агульнаменскае свята беларускага значка, калі па ўсяму гораду гучала беларуская мова і прадаваліся значкі ў бела-чырвона-белых колерах.

У сакавіку 1917 года Скірмунт быў абраны старшынёй Беларускага нацыянальнага камітэту, дэлегацыя ад якога ездзіла ў Петраград для рашэння беларускага нацыяльнага пытання і патрабавання аўтанамоіі для Беларусі, але сустрэла адмову. У снежні 1917 года на Першым Усебеларускім з'ездзе было прадстаўлена 1872 дэлегата, сярод якіх быў і Рамант Скірмунт.

Знаходзячыся ў складзе Ураду БНР, Раман Скірмунт шукаў падтрымку маладой дзяржавы ў Нямеччыне, але гэтыя пошукі скончыліся нічым. Такое ж стаўленне да Беларусі праявіла і Польшча. Бальшавіцкая ўлада бачыла ў Скірмунце ворага, заходнія краіны глядзелі з недаверам на чалавека, які здаваўся ім амаль бальшавіком. Беларускія сацыялісты, не падтрымаўшыя ідэі

землеўладання сялянамі, называлі яго «кансерватарам».

Так і не рэалізаваўшы на практыцы прагрэсіўныя ідэі стварэння самастойнай беларускай дзяржавы, Раман Скірмунт вяртаецца на Піншчыну, дзе займаецца эканамічнай і сацыяльнай сферамі. У ягоных уладаннях дзейнічалі суконная мануфактура і цукровы завод, а пры маёнтку дзейнічалі школа і шпіталь. Акрамя гэтых заслуг Скірмунт арганізаваў аўтобусны маршрут да Пінска, праклаў дарогу і арганізоўваў сельскагаспадарчыя ярмаркі для сялян, якім таксама выдаваў матэрыял для будаўіцтва гаспадарчых пабудоў. Пры ягонай фабрыцы былі пабудаваны 4 дамы на 90 кватэр і 4 інтэрната для несямейных. Аплачваў паслугі доктара і ўтрымліваў бясплатнае вучылішча, у якім дзеці навучаліся грамаце і ткацтву. У гэты час быў пабудаваны касцёл Сэрца Езуса, які не дайшоў да нашых дзён, створаны унікальны парк у англійскім стылі, расліны ў які завозіліся з Еўропы, ЗША і Канады.

Мараю Рамана Скірмунта было пабудова дзяржавы, якая б ахоплівала ўсе этнічныя беларускія землі і з'яўлялася эканамічна и палітычна магутнай, паспяховай. Таму на  пытанне, кім сябе адчувае, адказваў, што ён нашчадак літоўскай сям'і, якая жыве ў Парэччы з XVII ст. Як асоба, якая добра разбіралася ў палітыцы і ў сельскай гаспадарцы, Раман Скірмунт аказаўся тым чалавекам, які мог паспяхова кіраваць эканомікай і адстойваць інтарэсы народа на міжнароднай арэне.

Аднак у 1939 годзе беларускія землі былі аб'яднаны, а ўмовы ганебнай Рыжскай дамовы скасаваны. Сустракаць савецкую ўладу Раман Скірмунт не баяўся, таму і не думаў хавацца ад яе. Сцвярджаў, што перажыў на сваіх землях і Першую сусветную, і савецка-польскую і грамадзянскую войны, таму баяцца яму няма чаго і на сваёй зямлі ён і застанецца. Але пасля ўваходу Заходняй Беларусі ў склад БССР Раман Скірмунт быў арыштаваны і растраляны .

Удзячныя сяляне на магіле Скірмунта паставілі драўляны крыж, які ў пачатку 1990-ых быў заменены металічным. Цяпер на Піншчыне інсуе традыцыя: штогод у дзень абвяшчэння БНР 25 сакавіка і дзень нараджэння Рамана Скірмунта 25 красавіка ўдзячныя людзі наведваюць ягоную магілу.